УДК 821. 161. 3 – “19” 09 (075. 8)

***Мельнікава А. М.,***
*Установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны”*

# ГІСТОРЫЯ ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ (ПАВОДЛЕ ПУБЛІЦЫСТЫКІ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА)

*У статті аналізуються погляди одного з ідеологів білоруського національного відродження початку XX століття Вацлава Ластовського на історію як фактор національної ідентифікації. Історичний наратив виступає в якості однієї з головних форм, в рамках якої розвивалася національна проблематика в білоруській літературі.*
***Ключові слова**: національна ідентичність, історія, концепція, співтовариство, ідея, публіцистика, міфологізація, колонізація.*

*В статье анализируются взгляды одного из идеологов белорусского национального возрождения начала XX столетия Вацлава Ластовского на историю как фактор национальной идентификации. Исторический нарратив выступает в качестве одной из главных форм, в рамках которой развивалась национальная проблематика в белорусской литературе.*
***Ключевые слова**: национальная идентичность, история, концепция, сообщество, идея, публицистика, мифологизация, колонизация.*

*The article analyzes the views of ideologist of the Belarusian national revival of the early 20th century, Vaclav Lastouski on history as a factor of national identity. The historical narrative serves as one of the main forms, within the framework of which national problems develop in the Belarusian literature.*
***Key words**: national identity, history, concept, community, the idea, journalism, mythology, colonization.*

**Пастаноўка навуковай праблемы і яе значнасць.** Пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці належаць да фундаментальных праблем літаратуразнаўства. Вывучэнне спецыфікі нацыянальнага ў мастацкім слове заяўлена сёння як першаступенная задача беларускага літаратуразнаўства [4].

**Мэта:** асэнсаваць працэс станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці і нацыянальнай ідэі ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя.

**Задача:** прааналізаваць погляды аднаго з ідэолагаў беларускага нацыянальнага адраджэння пачатку ХХ стагоддзя Вацлава Ластоўскага на гісторыю як важкі чыннік нацыянальнай ідэнтыфікацыі.

**Выкладанне асноўнага матэрыялу і абгрунтаванне атрыманых вынікаў даследавання.** Выключная роля ў асэнсаванні спецыфікі беларускай ідэнтычнасці належыць Вацлаву Ластоўскаму (1883-1938), аднаму з ідэолагаў нацыянальнага адраджэння пачатку ХХ стагоддзя, таленавітаму пісьменніку, публіцысту, вучонаму, дзяржаўнаму дзеячу, “пачынальніку беларускага фундаменталізму”, згодна з вызначэннем Ул. Конана [2, с. 240]. Асновы гэтай ідэалогіі выкладзены ў шматлікіх публіцыстычных артыкулах аўтара (“Нацыянальнае пытанне”, “Нашы цэннасці”, “Прадмова да № 1 часопіса “Крывіч”, “Прамова ў Жэневе”, “Прадмова да “падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка”, “Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў”, “Патрыятычны малітвеннік”, “Прадмова да “Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі”, “Уступны артыкул да № 1 часопіса “Крывічанін” і інш.).

Важную ролю ў працэсе станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці адыгрывае гістарычная свядомасць, супольная гістарычная памяць. Вядома, што адчуванне нацыянальнай прыналежнасці мае як прасторавае, так і часовае вымярэнне. Згодна Б. Андарсану, нацыя – гэта супольнасць са сваім мінулым, сучасным і будучыняй. Нацыянальная гісторыя – гэта своеасаблівы наратыў, які разгортваецца вакол пэўных падзей і персанажаў. Выбар гэтых падзей не з’яўляецца выпадковым, а падпарадкаваны запатрабаваннем нацыі ў асэнсаванні яе сучаснага становішча. Знаны сучасны даследчык этнічнасцей і нацыянальнага, прафесар сацыялогіі Лонданскага ўніверсітэта Энтані Сміт пісаў: “Кожная нацыя абумоўлівае самавызначэнне сваіх членаў, таму што яе спецыфічная культура фармуе асобу. Ключом да гэтай культуры з’яўляецца гісторыя, пачуццё гістарычных архетыпаў, якія перадаюцца да новых і новых пакаленняў. <…> Чалавек вызначае сябе, у адпаведнасці з нацыянальнай ідэяй, праз сваю сувязь з продкамі і папярэднікамі, а таксама з падзеямі, якія сфармавалі іх светаўспрыняцце” [6, с. 13]. Эрык Хабсбаўм адзначаў: “Нацыі без мінулага – гэта свайго роду супярэчлівасць у тэрмінах. Мінулае і ёсць тое, што стварае нацыю; менавіта мінулае нацыі апраўдвае яе ў вачах іншых” [7, с. 332].

Праблемы мінулага займаюць істотнае месца ў публіцыстыцы В. Ластоўскага. Менавіта В. Ластоўскі закладае ў ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры матыў мінулага Беларусі як сведчанне нацыянальнай і дзяржаўнай велічы. Паказальна, што В. Ластоўскі адным з першых паспрабаваў сфармаваць беларускі пункт погляду на ўласную гісторыю, стаўшы аўтарам першага даследавання па нацыянальнай гісторыі на беларускай мове (“Кароткая гісторыі Беларусі” (Вільня, 1910)). У прадмове да выдання ён пісаў: “Гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны. А фундамент у нас важны, гісторыя наша багата” [2, с. 5]. У рабоце В. Ластоўскага гісторыя Беларусі паўстае не як гісторыя аб’екта, а як гісторыя суб’екта: “Адно толькі пазволіў я сабе: некаторыя здарэньні асудзіць па свойму з становішча карысьцей і шкод беларускаго народу” [2, с. 5]. Аналагічныя меркаванні выкладзены і ў рэцэнзіі на “Гісторыю Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця” У. Ігнатоўскага і ў рэцэнзіі на “Гісторыю Беларусі” У. Пічэты. В. Ластоўскі падкрэслівае: “Нам у нашай гісторыі, у час адраджэння народа, патрэбна аб’ектыўнае абаснаванне яго кроўнага права на самаістасць, а не апраўданне чужацкага панування над намі” [3, с. 388].

Сіла нацыі, на думку В. Ластоўскага, залежыць ад глыбіні самаўсведамлення сваёй далучанасці да супольнасці, што адпавядае сучасным навуковым уяўленням пра працэс ідэнтыфікацыі: “Найбольш сілы мае той народ, каторы патрапіў усіх сваіх членаў злучыць у адно, дзе ўсе думаюць і пачуваюць, як адзін чалавек, а кожын – так,

© *Мельнікава А. М.,* 2012

як усе, хто належыць да гэтай нацыі, творачы, аднак, такую гарманічную цэласць, што аддзельныя асобы могуць найшырэй выявіць усе свае асобеннасці, усю арыгінальнасць сваёй творчасці" [3, с. 256].

Вызначальнымі ў В. Ластоўскага выступаюць наступныя палажэнні: Беларусь у мінулым перажыла стадыю высокай культуры, дзяржаўнасці (артыкулы "Раздзелы і сваркі", "Прадмова да "падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка", "Патрыятычны малітвеннік", "Прадмова да "Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі"). Аднак страта дзяржаўнай незалежнасці спачатку ў выніку саюзу з Польшчай, а пасля падзелаў Рэчы Паспалітай прывялі да заняпаду. Цікавую заўвагу на гэту конт зрабіў польскі даследчык Р. Радзік. Не пагаджаючыся з ацэнкай В. Ластоўскім саюзу з Польшчай як згубнага для Беларусі, вучоны піша: "Бяспрэчна, прабеларускае нацыянальнае мысленне дамінуе ў Ластоўскага над гістарычнай кампетэнтнасцю" [5, с. 264]. Зрэшты, Р. Радзік адзначае, што галоўнай мэтай працы В. Ластоўскага было фармаванне новай нацыянальнай ідэі, мабілізацыя нацыі на змаганне за сваю незалежнасць шляхам міфалагізацыі гісторыі: "Беларусы ў гэтым выпадку не адрозніваліся ад астатніх" [5, с 269].

У В. Ластоўскага міфалагізацыя нацыянальнай гісторыі становіцца асновай афармлення нацыянальнага міфу. В. Ластоўскі імкнецца замацаваць у свядомасці сучаснікаў усведамленне пра нацыянальную і дзяржаўную сталасць Беларусі. Генеалогія беларускай дзяржаўнасці выводзіцца ім ад Полацкага і Тураўскага княстваў, Вялікага Княства Літоўскага. В. Ластоўскі выбудоўвае пантэон беларускіх дзяржаўных (князь Рагвалод, Усяслаў, Рагнеда, Вітаўт, Ягайла, Кейстут, Гедымін, Жыгімонт, Леў Сапега, Радзівілы, Хадкевічы), культурных дзеячаў (Сімяон Полацкі, Пётр Мсціславец, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Л. Кандратовіч, Э. Ажэшка, М. Багдановіч, С. Палуян ("Памяці Сяргея Палуяна", "Пятрок з Крошына", "Людвік Кандратовіч", "350-летняя гадаўшчына друку ў Маскоўшчыне", "Шляхам творчасці"), гістарычных дзеячаў (К. Каліноўскі). Піша, што раней у Беларусі прыгону не было: "Няволі асабістай нашы прадзеды не знялі, кром людзей, узятых на вайне ў няволю і то толькі ў першым калене" [3, с. 264]. В. Ластоўскі падае цікавыя звесткі пра артэфакты беларускай культуры ("Рухомыя друкарні на Беларусі і Украіне", "Кальвінскія зборы на Беларусі", "Новагародская аўтакефальная мітраполія", "Крыўскі варыянт быліны аб Іллі Мурамцы", "Віленская грэка-лаціна-руская акадэмія", "Пачайнская друкарня", "Крыўскі (беларускі) старадаўні лістоўны стыль", "Беларускія (крыўскія) друкі ў Тыльзіце", "Аб лесаўчыках", "Земскія суды", "Копныя суды", "Станы ў старой Беларусі). Разглядае гісторыю беларускага вызваленчага руху ("Памяці справядлівага", "Прычыны заняпаду беларускага адраджэння ў XIX ст. ").

Істотным у публіцыстычных артыкулах В. Ластоўскага з'яўляецца даследаванне механізмаў і вынікаў каланізацыі. Перш за ўсё гэта забарона беларускай мовы, уніяцкай веры, кніг на беларускай мове, русіфікацыя царквы, паланізацыя касцёла ("Канкардат"), сацыяльны прыгнёт: "Гэтак стогадовае наша жыццё ў Расіі не дало нам з нацыянальнага боку ніякіх карысцяў, адно ўціск і абмаскоўленне" [3, с. 320] ("Беларусь пад Расеяй", "Паленне кніг на Беларусі", "Новы падзел Беларусі", "Прамова ў Жэневе", "Патрыятычны малітвеннік", "Прадмова да "Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі"). В. Ластоўскі акрэслівае сутнасць палітыкі каланізацыі: абвясціць каланіяльны народ ніжэйшым у культурных адносінах, вынішчаючы нацыянальную адметнасць і навязваючы ўласную культуру як вышэйшую: "Каб падсаладзіць горкую пігулку, вынішчаючы нацыянальны тып, паніжаючы арыгінальнасць перасіленага народа, усе дэнацыяналізатары кажуць, быццам ад іх работы ўзрастае культура і багацце паднявольных народаў" [3, с. 257]. У артыкуле "Нацыянальнае пытанне" В. Ластоўскі піша пра вынікі каланізацыі, небяспеку духоўнага нівелявання: "… з утратай незалежнасці кожны народ трапляе пад уплыў пераможцы і памалу загубляе сваю індывідуальнасць, а разам з ёй і сваю індывідуальную культуру" [3, с. 316]. Звяртаецца В. Ластоўскі і да праблемы страты нацыянальнай памяці, нават назвы зямлі ("Аб назовах "Крывія" і "Беларусь", "Прадмова да "падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка").

Важнай у дактрыне дзяржавы В. Ластоўскага з'яўляецца палажэнне пра гістарычную місію. Паводле В. Ластоўскага, гістарычная місія Вялікага Княства Літоўскага заключалася ў "змаганні з татарскай навалай". Гістарычная місія "заходняй лініі крывічоў", на думку пісьменніка, у яднанні "ўсіх трох галін крывічанскага племя" [3, с. 399]. Акрамя таго, вучоны фармулюе нацыянальныя задачы нават у сусветным маштабе, і гэтыя задачы звязаны перш за ўсё з культурнай місіяй: "Крывічанская славяншчына ў цэлым павінна даць чалавецтву новыя культурныя цэннасці" [3, с. 399].

**Высновы і перспектывы далейшага даследавання.** На прыкладзе тэкстаў В. Ластоўскага мы бачым працэс фармавання нацыянальнай свядомасці ў процівагу этнічнай, уяўленні пра мінулае ў гэтым працэсе. У творах В. Ластоўскага Беларусь выступае як суб'ект гісторыі, а гістарычны наратыў у цэлым з'яўляецца адной з асноўных формаў, у рамках якіх развівалася нацыянальная праблематыка ў беларускай літаратуры.

**Літаратура:**

1. Конан Ул. Эстэтычныя погляды Вацлава Ластоўскага / Ул. Конан // Беларусіка=Albaruthenica : Кн. 4 – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – С. 239-251.
2. Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ластоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1993 – 126 с.
3. Ластоўскі В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997 – 512 с.
4. Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М. А. Тычына і інш. : навук. рэд. М. А. Тычына. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 363 с.
5. Радзік Р. Беларускі нацыятворчы працэс у параўнанні з украінскім, чэшскім і славацкім / Р. Радзік // Беларусіка=Albaruthenica : Кн. 29. – Мінск, 2010. – С. 264-274.
6. Сміт Энтані Д. С. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / Э. Сміт. – Мн. : Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 272 с.
7. Хобсбаум Эрик Принцип этнической принадлежности и национализм в современной Европе / Э. Дж. Хобсбаум // Нации и национализм / Б. Андерсон, О. Бауэр, М. Хрох и др. – М. : Праксис, 2002. – С. 332-346.